# ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕ БЕЖАНЦАЎ ГОЛАДА З ПАВОЛЖА Ў САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ (1921–1923 гг.)

*Г.Х. Базарэвіч*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

Голад у Паволжы, які пачаўся з вясны 1921 г., выклікаў буйны наплыў бежанцаў у Беларускую ССР, а таксама ў Гомельскую і Віцебскую губерні РСФСР. Каб задаволіць патрэбы пацярпелых ад голаду неабходны былі вялікія сродкі. У першую чаргу на аказанне медыцынскай дапамогі, забеспячэнне чыстай вопраткай і бялізнай, харчаваннем. Часткова скараціць выдаткі на ўтрыманне бежанцаў дазволіла працаўладкаванне.

Мэта даследавання – вызначыць шляхі забеспячэння працай бежанцаў голада з Паволжа ў савецкай Беларусі.

**Матэрыял і метады.** Для даследавання былі выкарыстаны матэрыялы Нацыянальнага архіву Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці, архіву грамадскіх аб'яднанняў Магілёўскай вобласці. Падчас працы былі выкарыстаны агульнанавуковыя і спецыяльна-гістарычныя метады: гісторыка-тыпалагічны і гісторыка-сістэмны.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Уплыў голаду на рост беспрацоўя праявіўся ўжо ў верасні 1921 г. З вялікіх тэрыторый, ахопленых голадам у пошуках працы рушыла хваля бежанцаў. Разбураная прамысловасць і гаспадарка не маглі забяспечыць усіх працай. Не прынесла чаканага выніку і пераразмеркаванне працоўнай сілы. У жніўні 1921 г. у Віцебскай губерні РСФСР было зарэгістравана 2166 беспрацоўных, у Гомельскай – 7784 [1, с. 74].

Сярод перасяленцаў былі інваліды здольныя да працы і тыя, хто не мог займацца ніякімі відамі работ, а таксама працаздольныя асобы. Для першай групы ў савецкай Беларусі ствараліся ўмовы, каб забяспечыць іх занятасць. Народным камісарыятам сацыяльнага забеспячэння былі адпушчаны крэдыты на закупку машын для абсталявання швейных, тэкстыльных і шавецкіх майстэрняў для інвалідаў Бабруйскага, Барысаўскага, Слуцкага, Мазырскага і Ігуменскага паветаў ў суме 2 тыс. руб. Такая жа сума была вылучана для арганізацыі шчотачнай, пераплётнай і кошыкавай майстэрняў для сляпых [2, арк. 241].

Востра стаяла праблема беспрацоўя, асабліва сярод некваліфікаваных працоўных, пастаянным крыніцай папаўнення якіх была хваля бежанцаў голада. Дзяржава выкарыстоўвала розныя сродкі для рэгулявання гэтага пытання, аднак гэта было немагчыма ажыццявіць ва ўмовах станаўлення новай эканамічнай палітыкі. Прыток беспрацоўных быў больш інтэнсіўны за рост савецкай эканомікі.

У савецкай Беларусі асноўным відам садзейнічання перасяленцам з Паволжа ў сферы працаўладкавання было стварэнне арцеляў і майстэрняў. Такім чынам Мінскай вытворчай арцелі вяровачнікаў быў выдадзены беспрацэнтны крэдыт у памеры 10 тыс. руб. дзеля таго, каб былі створаны працоўныя ўмовы для 18 чалавек. На аналагічных умовах такую ж суму атрымала Мінская арцель шорнікаў, якая абавязвала працаўладкаваць усіх спецыялістаў сферы, што былі зарэгістраваныя на біржы працы, а іх налічвалася каля 10 чалавек. 40 беспрацоўных былі ўладкаваны ў вытворчую арцель абутнікаў. На сталае месца працы ў арцелі швейнай вытворчасці былі ўзяты 25 чалавек. Саюзу працоўных паліграфічнай вытворчасці была выдадзена пазыка ў памеры 35 тыс. руб. для стварэння арцелі пераплётчыкаў, якая магла даць занятак 25 чалавекам [2, арк. 241]. Для стварэння новых працоўных месцаў такім чынам было пашырана канторскае бюро пры саюзе савецкіх служачых. А для абсталявання двух калектыўных цырульняў саюзу працоўных камунальнай гаспадаркі было выдадзена 10 тыс. руб., што дазволіла ўладкаваць 56 чалавек [2, арк. 241 зв.].



Рэпазіторый ВДУ

Цэнтральная камісія па ліквідацыі наступстваў голаду Беларусі вылучала таксама бязвыплатныя субсідыі Народнаму камітэту працы для аказання дапамогі беспрацоўным. Аналагічная практыка з вылучэннем крэдытаў на рэарганізацыю працоўных месцаў была і ў паветах рэспублікі. Напрыклад, дзякуючы субсідыі ў 10 руб. з Бабруйскай біржы працы было знята 40 чалавек. Увесь расход сродкаў ЦК Паследгол савецкай Беларусі на ўладкаванне беспрацоўных склаў 235 780 рублёў [2, арк. 241 зв.]. Дзеля таго, каб пазбегнуць павелічэння колькасці беспрацоўных крызісным прадпрыемствам вылучаліся крэдыты толькі дзеля таго, каб там не пачалося скарачэння штата. Так адбылося з чыгуналіцейным і машынабудаўнічым заводам "Энэргія", якому была выдадзена субсідыя ў памеры 75 тыс. руб.

У Віцебскай і Гомельскай губернях РСФСР назіралася падобная сітуацыя – вылучэнне грошай на ўтрыманне беспрацоўных. Так у Віцебску Губкампаследгол вылучыў аддзелу працы пры губвыканкаме 25 000 пудоў збожжа [3, арк. 88]. З сярэдзіны 1923 г. адлічэнні з заробкаў прыпыніліся і крыніц даходаў камісія не мела, таму для папаўнення сродкаў было адчынена дзве крамы, якія пасля ліквідацыі камісіі па барацьбе з наступствамі голаду былі перададзены ў ведамства камітэта біржы працы для таго, каб увесь даход за выключэннем 15% накіроўваўся на змяншэнне беспрацоўя (а 15% даходаў – на аказанне дапамогі бесрытульным дзецям) [4, арк. 10].

Для падтрымкі беспрацоўных у г. Віцебску пры ўдзеле грамадскіх арганізацый і ўстаноў са жніўня 1922 г. было адкрыты "Дом беспрацоўнага", які ўтрымліваўся за кошт прафсаюзаў і страхавой касы. Дом з начлегам быў разлічаны на 45 беспрацоўных, аднак фактычны яго абарот быў большы [5, с. 263].

Для бежанцаў, якія не мелі цяжкасцей са здароўем, арганізоўваліся грамадскія працы. Перавагаючымі відамі работ былі лесанарыхтоўкі, абсталяванне дарог, уборка гарадскіх тэрыторый. У буйных гарадах – Мінску, Віцебску, Гомелі праводзіліся працы па прывядзенні ў належны санітарны стан вуліц, прыборку разбураных пабудоў. У Мінску і Віцебску штодзень былі занятыя па 25–30 чалавек. Арганізацыя прац ажыццяўлялася на мясцовыя сродкі, часцей за ўсё пры фінансаванні камунальнай гаспадаркі [6, с. 55].

Мясцовым камісіям па аказанні дапамогі бежанцам Паволжа ў супольнасці з аддзеламі працы прапаноўвалася стварыць шэраг арцеляў і майстэрняў для беспрацоўных жанчын. Першапачаткова былі арганізаваныя такія ўстановы, якія не патрабавалі вялікіх выдаткаў на абсталяванне. Таксама працаваць на падобных майстэрнях маглі работніцы, што не валодалі адмысловымі навыкамі. Да такога віду прадпрыемстваў адносіліся арцелі, што займаліся шыццём, рамонтам (адзення, бялізны), вязальныя арцелі (машыннае і ручное вязанне панчох, рукавіц), пральні, майстэрні па вытворчасці вырабаў з паперы і кардону, дзіцячых цацак.

У арганізацыі прац удзельнічала таксама і сельскагаспадарчая кааперацыя. Камунальная гаспадарка і зямельнае кіраванне вылучалі землі беспрацоўным для заняткаў сельскай гаспадаркай. Часта здараліся выпадкі адмовы жанчын ад працы з-за таго, што ім не было з кім пакінуць сваіх малалетніх дзяцей. Таму асаблівая ўвага надавалася арганізацыі і падтрымцы ясляў і дзіцячых дамоў. Рэгуляванне занятасці ажыццяўлялася праз камітэты біржаў працы [7, арк. 192].

Пасля праца па барацьбе з жаночым беспрацоўем была пашырана. Пры біржах працы з дапамога арганізацый прафесійнай адукацыі і прафсаюзаў былі арганізаваныя кароткатэрміновыя курсы для навучання і перападрыхтоўцы больш запатрабаваным прафесіям. Планавалася ўладкаванне жанчын, асабліва падлеткаў у прафесіянальна-тэхнічныя школы і тэхнікумы, наданне ім стыпендыі.

Да працы па барацьбе з жаночым беспрацоўем акрамя аддзелаў працы, камісіі дапамогі галадаючым Паволжа былі прыцягнуты жаночыя аддзелы, прафсаюзы, камісіі па барацьбе з прастытуцыяй, а таксама гаспадарчыя органы, што дапамагалі забяспечыць тэхнічны бок арганізацыі майстэрняў і арцеляў. Агульнае кіраўніцтва дзейнасці па ўладкаванню беспрацоўных ажыццяўляла камісія грамадскіх прац пры прадстаўніцтвах паследгол, а там, дзе яны адсутнічалі – біржы занятасці.

**Заключэнне.** Забяспечыць працай усіх, хто прыбыў з галадаючых губерняў было цяжка. Частымі былі выпадкі, калі бежанцы больш за год знаходзіліся без працы і жылі ў вельмі сціснутых умовах. Тым не менш, у меру сваіх магчымасцяў, дзяржаўныя органы савецкай Беларусі падыходзілі да гэтага працэсу дэталёва: беспрацоўныя ставіліся на ўлік біржы і паступова атрымлівалі месца на прадпрыемстве. Тыя, хто не валодаў ніякай прафесіяй ці навыкамі

Рэпазіторый ВДТУ

маглі атрымаць спецыяльнасць альбо ўладкавацца ў вытворчую арцель і майстэрню. Для маці з малалетнімі дзецьмі былі арганізаваныя дзіцячыя садкі і яслі.


1. Ликвидация безработицы в СССР 1917-1930 гг. / / Л.С. Рогачевская. – АН СССР. Ин-т истории СССР. – М. : Наука, 1973. - 382 с.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 6. – Воп. 1. – Спр. 97. Доклад по обследованию и наблюдению за деятельностью ЦК Помледгола и его органов с августа 1921 года по настоящее время.
3. Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Маглёскай вобласці – Ф. 6643. Воп. 1. – Спр. 104. Переписка с партийными, советскими органами, партячейками об организационно-партийной работе.
4. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. – Ф. 95. – Воп. 1 – Спр. 357. Дело о ликвидации Витебской губернской комиссии по борьбе с последствиями голода и передаче подведомственных ей учреждений по борьбе с безработицей комитету биржи труда.
5. Сергеенко А.В. Безработица в СССР в 1920-е гг. и борьба с нею / А.В. Сергеенко // Научный потенциал молодежи – будущему Беларуси: материалы V Международной молодежной научно-практической конференции, УО "Полесский государственный университет", г. Пинск, 31 марта 2011 г.: в 4 ч. Ч. 2 / Национальный банк Республики Беларусь [и др.]; редкол.: К.К. Шебеко [и др.]. – Пинск: ПолесГУ, 2011. – С. 262 – 263.
6. Исаев, А.А. Безработица в СССР и борьба с нею. (За период 1917-1924 г.г.) / А. Исаев. – М. : Вопросы труда, 1924. – 79 с.
7. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. – Ф. 95. – Воп. 1 – Спр. 57. Постановления и циркуляры Наркомата труда РСФСР, переписка с Наркоматами труда и уездными отделами труда о порядке направления безработных на работу через биржи труда.


# АДМІНІСТРАЦЫЙНАЯ ПРЫНАЛЕЖНАСЦЬ ВІЦЕБСКАЙ ГУБЕРНІ Ў ПАЧАТКУ 1919 ГОДА


*А.В. Бараноўскі*
*Мінск, Інстытут гісторыі НАН Беларусі*


Фарміраванне дзяржаўнай тэрыторыі Беларусі з'яўляецца актуальнай тэмай для разумення гістарычнага шляху беларускага дзяржавы. Тым не менш дадзенае пытанне вывучана недастаткова, асабліва на лакальным узроўні. Часта пазіцыі губернскага і мясцовага кіраўніцтва адрозніваюцца кардынальна.

Мэтай нашага даследавання з'яўляецца вывучэнне фарміравання адміністрацыйнай прыналежнасці Віцебскай губерні ў пачатку 1919 года.

**Матэрыял і метады.** У працэсе даследавання былі выкарыстаны матэрыялы Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці. Метадамі даследавання з'яўляюцца агульнанавуковыя і спецыяльна-гістарычныя метады: гісторыка-тыпалагічны і гісторыка-сістэмны.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Пасля прыходу да ўлады ў Польшчы Ю. Пілсудскага, быў узяты курс на падрыхтоўку ваеннай інтэрвенцыі ў савецкую Расію. У сувязі з гэтым ЦК РКП(б) прыняў рашэнне стварыць уздоўж заходняй мяжы РСФСР бар'ера з фармальна незалежных савецкіх дзяржаў. Беларуская рэспубліка павінна была стаць апошнім звяном у ланцугу, якая б аддзяліла савецкую Расію ад капіталістычных дзяржаў.

У ноч з 1 на 2 студзеня 1919 г. у Смаленску быў абвешчаны Маніфест аб утварэнні Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі. Віцебская, Гродзенская, Магілёўская, Мінская і Смаленская губерні ўвайшлі ў яе склад. Адразу пасля абвяшчэння рэспублікі з губерняў у ЦК РКП(б) пайшлі звароты з пратэстамі супраць утварэння ССРБ і ўключэння ў яе склад. Найбольш непрымальную пазіцыю адносна далучэння да Беларускай рэспублікі заняла Віцебская партыйная арганізацыя.

2 студзеня ў Віцебску адбылося пасяджэнне мясцовага партыйнага камітэта РКП(б), на якім Віцебскае партыйнае кіраўніцтва выказалася прынцыпова супраць стварэння Беларускай Рэспублікі [1, арк. 1]. Падчас наступнага пасяджэння, якое адбылося 9 студзеня, абмяркоўваліся ўзаемаадносіны паміж Віцебскім губвыканкамам і Беларускім наркаматам. Так, П.К. Сяргіеўскі адзначыў, што паколькі Беларуская рэспубліка была створана абласной канферэнцыяй партыі, то неабходна практычна падпарадкоўвацца Беларускаму наркамату. Старшыня губкама РКП(б) С.М. Крылоў заявіў, што ў Маскву дэлегавана С.І. Шейдліна, якая павінна там высветліць, ці можна будзе губернскаму з'езду Саветаў і канферэнцыі партыі падняць пытанне супраць стварэння Беларускай рэспублікі, а зараз мясцоваму кіраўніцтву неабходна падпарадкоўвацца Беларускай рэспубліцы [1, арк. 4 аб.–5].

16 студзеня адбыўся агульны сход Віцебскай арганізацыі РКП(б), на якім М.А. Еўсцігнееў праінфармаваў прысутных, што атрымана тэлеграма, згодна з якой па патрабаванню Беларускай рэспублікі неабходна ўзаемадзейнічаць з Вышэйшым Саветам народнай гаспадаркі ССРБ, а не з Цэнтрам як раней. На думку Еўсцігнеева, Беларусь магчыма вылучыць



Рэпазіторый ВДУ